практычнымі навыкамі выкладчыка-метадыста.

Метадалагічную аснову мастацка-педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў складае філасофія, і ў прыватнасці эстэтыка.

У 1993/94 навучальным годзе блок агульнапедагагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў уключае псіхалогію і педагогіку (агульную і галіновую).

Спецыяльную педагагічную падрыхтоўку студэнтаў забяспечваюць прыватныя методыкі і педагагічная практыка. Пры 5-гадовым тэрміне навучання спецыяльная педагагічная падрыхтоўка павінна пачынацца з УП семестра, бо толькі ў такім выпадку будзе забяспечана пераемнасць паміж агульнапедагагічнай і спецыяльна-педагагічнай падрыхтоўкай студэнтаў. Аднак у існуючым вучэбным плане гэтая пераемнасць адсутнічае.

Так, эстэтыка (метадалогія мастацка-педагагічнай дзейнасці спецыяліста) вывучаецца пасля засваення агульнатэарэтычных прадметаў, а прыватныя методыкі на некаторых спецыялізацыях чытаюцца раней за агульнатэарэтычныя курсы і г.д.

У некаторых выпадках прыватныя методыкі выкладаюцца ў межах іншых дысцыплін спецыялізацыі (спецінструмента, пастаноўкі танца, аранжыроўкі, методыкі работы з творчым калектывам і інш.).

Вучэбная педагагічная практыка часам зводзіцца да засваення методыкі работы з творчым калектывам над рэпертуарам і на некаторых кафедрах распачынаецца толькі ў гэтым навучальным годзе.

Няма адзінства ў вызначэнні неабходнай колькасці гадзін для вывучэння методык і арганізацыі вучэбнай педагагічнай практыкі.

Усё гэта сведчыць пра адсутнасць адзінай канцэпцыі падрыхтоўкі студэнтаў мастацкіх спецыялізацый да педагагічнай дзейнасці. У той жа час удасканаленне падрыхтоўкі арганізатараў мастацкай (народнай) творчасці кафедры звязваюць менавіта з набыццём імі педагагічнай кваліфікацыі.

Пераход універсітэта да шматузроўневай падрыхтоўкі спецыялістаў патрабуе ўнесці пэўныя карэктывы ў навучальны план з улікам азначаных вышэй заўваг і новых тэрмінаў:

1 -- 1У семестры -- агульная вышэйшая мастацкая адукацыя;

У -- УП семестры -- бакалаўрыят;

УШ -- Х семестры -- магістратура.

Ва ўмовах шматузроўневай падрыхтоўкі спецыялістаў спецыяльную педагагічную падрыхтоўку студэнтам трэба прайсці ў У--УП семестрах. Таму неабходна перанесці некаторыя дысцыпліны ў вучэбным плане на папярэднія семестры. Прапануецца наступны варыянт:

| Назвы дысцыплін | I | | II | | III | | IV | | V | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 1. Філасофія (140) | 72 | 68 | | | | | | | | |
| 2. Эстэтыка (70) | | 36 | 34 | | | | | | | |
| 3. Псіхалогія (144) | | | | | | | | | | |
| - агульная | | | 60 | | | | | | | |
| - узрост. і педагагіч | | | | 28 | | | | | | |
| - мастацкай тв-ці | | | | | 30 | | | | | |
| - сацыяльная | | | | | | 26 | | | | |
| 4. Педагогіка (100) | | | | | | | | | | |
| - агульная | | | | 60 | к.р. | к.р | | | | |
| - галіновая | | | | | 40 | | | | | |
| 5. Методыкі выкладан. | | | | | 36 | | | | | |
| 6. Практыка педагагіч. | | | | | | | | | | |
| - азнаямляльная | | | | | * | | | | | |
| - вучэбная | | | | | 14 | 17 | | | | |
| - перадДыпломная | | | | | | | * | | | |

* кафедра псіхалогіі і педагогікі

Такім чынам, профільная педагагічная падрыхтоўка студэнтаў мастацкіх спецыялізацый пачынаецца з Ш курса, ахоплівае У--УП семестры, што адпавядае бакалаўрыяту (сем семестраў).

Каралькоў М.А.,
канд.філас.навук,
дацэнт

## ПЕРАЕМНАСЦЬ У НАВУЧАННІ ЯК АДНА З УМОЎ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТА ВЫСОКАГА ЎЗРОЎНЮ

Адным з першых зрабіў спробу стварыць цэласную сістэму і канцэпцыю пераемнасці ў навучанні чэшскі педагог Я.А.Каменскі. Працэс навучання ён разглядаў як пастаяннае развіццё разнастайных ведаў, працяг раней пачатага.

Ідэя пераемнасці развівалася яшчэ ў свой час ў педагагічных поглядах Піфагора. Вялікую ўвагу ў сярэдзіне 1Х стагоддзя гэтай ідэі надаваў нямецкі педагог Дыстэрвег. У Расіі ж эфектыўна



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

развівалі Бялінскі, Адоеўскі, Герцэн і інш. Даволі паспяхова праблема пераемнасці рэалізоўвалася ў брацкіх школах.

Ствараючы сваю педагагічную сістэму, Ушынскі ўлічвае накірунак развіцця народнай школы і вызначае ў гэтай сістэме 2 цыклы, якія пераемна-ўнутрана звязваў у ланцужку: гімназія - ВНУ. Гэтыя цыклы ўлічвалі:

- змест навучання;
- арганізацыю навучальнага працэсу;
- методыку навучання.

Пераемнасць Ушынскім разглядалася:

- як прынцып пабудовы сістэмы народнай адукацыі, прынцып яе дзейнасці і развіцця;
- як важнейшая ўмова, што забяспечвае паспяховае навучанне;
- як працэс устанаўлення сувязі паміж новым і старым у набываемых ведах, як паслядоўнасць і паступовасць у вывучэнні прадметаў.

Праблема пераемнасці і ўзаемасувязі ступеняў падрыхтоўкі спецыялістаў у найбольшай ступені распрацавана ў цяперашні час у сістэме педагагічнай адукацыі. Прычым аналіз паказвае, што асноўная ўвага накіравана пры гэтым на даследаванне пераемнасці ў тэхналогіі вучэбных устаноў розных ступеняў, методыцы навучання, але пры гэтым слаба распрацавана праблема пераемнасці ў змесце навучання. Відавочна, што ізаляванае вывучэнне зместу адукацыі на ступенях сістэмы "школа - вучылішча (тэхнікум) - ВНУ" парушае цэласны падыход, пераемнасць і ўзаемасувязь у сістэме культуралагічнай адукацыі.

Як улічваецца пераемнасць у навучанні ў нашай ВНУ? Ці дастаткова яна ажыццяўляецца?

Знаёмства з вучэбнымі праграмамі, каляндарна-тэматычнымі планамі па розных дысцыплінах сярэдняй школы, вучылішч мастацтваў і культуры, музычных вучылішч, тэхнікумаў дало магчымасць убачыць даволі непрывабную карціну па шмат якіх дысцыплінах як агульнаадукацыйнага накірунку, так і спецыяльнага.

Возьмем, напрыклад, беларускую літаратуру. У вучылішчах мастацтваў на яе вывучэнне адводзіцца 60 гадзін. У нашым універсітэце -- 70 гадзін. Паўстае пытанне, як можна пазбегнуць паўтору, дубліравання тэм? І зноў студэнт вывучае творчасць Я.Купалы, Я.Коласа, К.Крапівы і г.д. Мяркуючы па вучэбнай праграме, якая складзена прафесарам Грынчыкам М.М., курс падаецца ў гістарычным аспекце, творчасць асобных літаратурных дзеячаў даецца ў адпаведнасці з карцінай культурна-гістарычнага развіцця Беларусі.

І гэта тое асноўнае, што адрознівае курс беларускай дакастрычніцкай літаратуры ва універсітэце ад выкладання аналагічнай дысцыпліны ў вучылішчах мастацтваў, музвучылішчах, у школах, дзе ў асноўным вывучаецца літаратура XIX стагоддзя.

Такім чынам, гэты курс (мяркуючы па тэматычным плане) дае дастаткова паглыбленае ўяўленне аб дакастрычніцкай літаратуры, аб яе месцы на гістарычным шляху развіцця Беларусі.

Можа выклікаць пытанне асвятленне творчасці Я.Купалы і Я.Коласа. Але ж аўтар курса імкнецца падаць іх творчасць праз прагляд пастановак, праслухоўванне музычных твораў, наведванне музеяў. Зразумела, гэта нашы класікі. Безумоўна, што такі паўтор тэм пашырае веды студэнтаў, прывівае любоў да беларускай літаратуры. Але ці ўсе выкладчыкі так робяць? На жаль, не. Некаторыя гоняцца за колькасцю твораў, а не за якасцю іх вывучэння. Вельмі цяжка пазбавіцца ад дубліравання тэм па такіх прадметах, як асновы эканамічнай тэорыі, гісторыя рэлігіі, беларуская мова, гісторыя Беларусі. У вучылішчах мастацтваў і ў школах на гэтыя прадметы даецца шмат гадзін - ад 80 па асновах эканамічнай тэорыі да 120 па гісторыі Беларусі. Калі, напрыклад, знаёмішся з праграмай па гісторыі Беларусі вучылішч, школ і нашага універсітэта, то амаль 90 працэнтаў тэм паўтараюцца. Разумею цяжкасці загадчыкаў кафедраў у гэтым сэнсе, але можна пайсці такім шляхам, як гэта робіць М.М.Грынчык.

У сувязі з тым, што Рэспубліка Беларусь стала незалежнай дзяржавай, паўстае пытанне аб пераглядзе выкладання і рускай літаратуры. Ці ёсць неабходнасць паўтараць школьную праграму, нават калі яна і выкладаецца на больш высокім узроўні?

А зараз я хачу спыніцца на пытанні пераемнасці ў выкладанні спецыяльных дысцыплін. Калі пазнаёміцца з планамі агульнаадукацыйных школ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, то не цяжка заўважыць, што нават у назвах прадметаў яны супадаюць амаль цалкам. Напрыклад, тэорыя музыкі, гармонія, сальфеджыо, гісторыя музыкі. Яны выкладаюцца і ў музычных школах, і ў музычных вучылішчах, і ў вучылішчах мастацтваў. І галоўнае тут, на мой погляд, каб пры складанні праграм па гэтых прадметах улічваліся ўжо тыя веды,якія атрымалі студэнты да паступлення ва універсітэт. Менавіта такога погляду прытрымліваюцца на кафедры тэорыі музыкі нашага універсітэта.Больш складанае пытанне па гісторыі музыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Лічу неабходным падкрэсліць, што гэтае пытанне патрабуе дадатковай працы, каб зняць паўторы і, можа быць, некаторыя тэмы, творы кампазітараў, якія вывучаліся да паступлення ва універсітэт, даваць для больш паглыбленага самастойнага вывучэння і, можа быць, нават некаторыя пытанні ўключаць у экзаменацыйныя білеты.

Ёсць пэўная спецыфіка, якую трэба таксама улічваць і на занятках па спецінструменту. Тут неабходна мець на ўвазе перш за ўсе тое, што студэнт да таго, як паступіў вучыцца да нас, набыў ужо шэраг спецыфічных навыкаў, якія сфарміравалі ў яго выкладчыкі музычнай школы, а пасля - музвучылішча ці вучылішча мастацтваў. За гады дауніверсітэцкай вучобы ім ўжо выконваўся нейкі рэпертуар. І галоўная задача выкладчыка не разбурыць тое добрае, што было зроблена да яго, а вельмі ўважліва і з павагай аднесціся да гэтага, нават калі і не зусім падзяляеш некаторыя прынцыпы, напрыклад трактоўкі твораў, пастаноўкі дыхання, рук і інш. Калі выкладчык пачне навязваць студэнту свае прынцыпы і ганіць тых выкладчыкаў, якія былі да яго, то нярэдка гэта прыводзіць да спынення прафесійнага росту студэнта ці да канфлікту паміж студэнтам і выкладчыкам. Вось чаму вельмі важна ведаць не толькі рэпертуар, які студэнт выконваў да паступлення ва універсітэт, але, можа, нават пазнаёміцца з выкладчыкам, які рыхтаваў гэтага студэнта, бо гэты выкладчык можа паведаміць аб яго моцных і слабых баках. Усё гэта будзе садзейнічаць больш грунтоўнай падрыхтоўцы спецыяліста высокага ўзроўню.

Не менш складаная задача стаіць і перад кафедрамі харэаграфіі, тэатральнай рэжысуры, народных рамёстваў. Тут таксама трэба не толькі добра ведаць праграму, па якой вялася падрыхтоўка былых абітурыентаў, але і асаблівасці школы таго ці іншага выкладчыка.

У заключэнне трэба падкрэсліць, што ў сувязі з пераходам універсітэта на двухузроўневую сістэму падрыхтоўкі спецыялістаў - бакалаўраў і магістраў - пераемнасць падрыхтоўкі неабходна разглядаць адным з важнейшых кампанентаў павышэння ўзроўню гуманітарнай адукацыі.

У сувязі з гэтым мэтазгодна вучылішчы культуры, мастацтваў, музвучылішчы ўключыць у агульную сістэму культуралагічнай падрыхтоўкі, дзе вядучым звяном будзе Беларускі універсітэт культуры. Неабходна тэрмінова ўзгадніць вучэбныя планы вучылішчаў з планамі універсітэта па адпаведных спецыяльнасцях. У працэсе ўзгаднення забяспечыць пераемнасць і не дапусціць дубліравання.

На наш погляд, было б мэтазгодным вырашыць пытанне аб пераўтварэнні асобных вучылішчаў мастацтваў (і ў першую чаргу Мінскага) у каледжы, зрабіць іх шматпрофільнымі. Гэта менавіта будзе садзейнічаць павышэнню ўзроўню і якасці падрыхтоўкі спецыялістаў як сярэдняга, так і вышэйшага звёнаў.

**Лягчылаў А.К.,**
прарэктар па навуковай рабоце
Беларускага універсітэта культуры

## АБ ПАДЫХОДАХ ДА АРГАНІЗАЦЫІ НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ Ў ВНУ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВА

Айчынная навука, як і грамадства, перажывае пэўны крызіс, які стаў асабліва абвастрацца ў апошнія гады. Знізілася якасць навуковых распрацовак, значна зменшылася колькасць перыядычных выданняў. І гэта толькі невялікая частка з шэрагу праблем, што перашкаджаюць нармальнаму развіццю навукі. Наогул, сёння, як ніколі, патрэбна ў цэнтралізавана-праграмнай форме вырашаць усе пытанні выхаду з гэтага крызісу. І, канешне ж, у першую чаргу пільная ўвага павінна быць звернута на фінансавае забеспячэнне даследаванняў.

Як вядома, яшчэ ў нядаўнія часы навука ў нас была арганізавана ў адрозненне ад існуючай ва ўсім свеце практыкі па-асобаму. Таму сёння ва ўмовах рынкавых адносін у развіцці эканомікі фінансаванне навукі патрабуе перагляду.

У нашай рэспубліцы фундаментальныя і прыкладныя даследаванні сканцэнтраваны ў трох асноўных структурах: акадэміі навук, навучальных установах і ў галіновых навуковадаследчых інстытутах і КБ.

Прыкладная навука заўсёды ва ўсім свеце традыцыйна фінансуецца на гаспадарчаразліковых пачатках фірмамі і прадпрыемствамі. Гэты падыход часткова сёння існуе і ў нас, і няма сумненняў, што ён павінен быць распаўсюджаны паўсямесна. Найбольш складанае пытанне -- гэта фінансаванне фундаментальных і пошукавых работ, якія заўсёды падпітваюцца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ